**Лясовіч Святлана Міхайлаўна**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: s.liasovich@psu.by

## КАНЦЭПТ «ВОЛЯ/СВАБОДА» У ПАЭЗІІ У. КАРАТКЕВІЧА

***Анатацыя:*** у артыкуле прадстаўлена спроба мадэлявання структуры канцэпту «воля/свабода» у паэзіі У. Караткевіча. Зроблены агляд вопыту вывучэння згаданага канцэпту ў беларускім мовазнаўстве. Вылучаны і прааналізаваны карэляцыі канцэпту з рознымі семантычнымі палямі. Акрэслены складнікі канцэпту, якія выразна прадстаўляюць яго сэнсавы аб’ём.

***Ключавыя словы:*** канцэпт, складнікі канцэпта, канцэптасфера нацыянальнай мовы, моўная карціна свету, Уладзімір Караткевіч.

**Sviatlana Liasovich**
Polotsk State University
e-mail: s.liasovich@psu.by

## THE CONCEPT OF «WILL / FREEDOM» IN THE POETRY OF ULADZIMIR KARATKEVICH

***Abstract:*** the article is an attempt to structure the concept of modeling «will/freedom» in the poetry of Uladzimir Korotkevich. An overview of the experience of studying this concept in Belarusian linguistics is made. The concept correlations with various semantic fields are identified and analyzed. Its components are defined, which clearly represent the semantic scope.

***Keywords:*** concept, concept components, sphere of concepts of the national language, linguistic world-image, Uladzimir Karatkevich.

Культурны досвед народа сканцэнтраваны ў канцэптасферы нацыянальнай мовы. Яна ўзбагачаецца ў вялікай ступені дзякуючы мове мастацкай літаратуры. Таму аналіз мовы літаратурных твораў мае вялікае значэнне для разумення важнасці асобных канцэптаў у моўнай карціне пэўнага этнасу. У беларускай літаратуры адным з выдатных мастакоў слова, у творчасці якога сканцэнтраваны нацыянальныя асаблівасці беларускага народа, з’яўляецца У. Караткевіч. На думку Д. Ліхачова, «кожны канцэпт па сутнасці можа быць па-рознаму расшыфраваны ў залежнасці ад непасрэднага кантэксту і культурнага досведу, культурнай індывідуальнасці канцэптаносьбіта» [5, с. 5], што можа дапамагчы прасачыць уплыў канцэптасферы асобнага пісьменніка на змены ў канцэптасферы мовы.

В.А. Маслава прапануе разумець пад тэрмінам «канцэпт» наступны змест:

– канцэпт – тэрмін, які служыць для тлумачэння адзінак ментальных і псіхічных рэсурсаў нашай свядомасці і той інфармацыйнай структуры, якая адлюстроўвае веды і вопыт чалавека;

– канцэпт – аператыўная змястоўная адзінка памяці, ментальнага лексікона, канцэптуальнай сістэмы і мовы мозга, усёй карціны свету, якая адлюстравана ў чалавечай псіхіцы;

– канцэпт – гэта семантычнае ўтварэнне, якое адзначана лінгвакультурнай спецыфікай і тым ці іншым чынам характаразуе носьбітаў пэўнай этнакультуры [6, с. 35].

Канцэпт «воля» ўяўляе сабой частку экзістэнцыяльных поглядаў народа і, безумоўна, мае аксіялагічны складнік. Сэнсавая структура любога канцэпта на першым этапе выяўляецца з дапамогай дэфініцыйнага аналізу ключавых слоў, што рэпрэзентуюць канцэпт.

Згодна з тлумачальным слоўнікам беларускай літаратурнай мовы, слова «воля» мае восем значэнняў: 1. Здольнасць ажыццяўляць свае жаданні, пастаўленыя перад сабой мэты. 2. Свядомае імкненне да ажыццяўлення чаго-н. 3. Жаданне, патрабаванне, (запавет). 4. Улада, права. 5. Свабода ў праяўленні чаго-н. 6. Свабода, незалежнасць; проціл. няволя. 7. Становішча, пры якім жыццё чалавека, жывёл, птушак не абмежавана ўмовамі зняволення. 8. Прастор, прыволле [9, с. 116]. Прыведзеныя значэнні можна падзяліць на дзве групы: 1–4 значэнні апісваюць волю як свядомую арганізацыю суб'ектам сваёй дзейнасці і паводзін; значэнні 5–8 абазначаюць волю як свабоду.

У беларускай мове праводзіліся асобныя даследаванні канцэпту «воля». Так, у працы Н.Ю.Паўлоўскай [7], воля была прадстаўленая сярод прэдыкатаў волевыяўлення і мадальных аператараў.

В.М. Гапеева [1] дае грунтоўнае апісанне канцэпту «воля» як аднаго з найважнейшых канцэптаў наіўнай моўнай карціны ў беларускай і англійскай мове, разглядаючы волю ў першых чатырох пазначаных слоўнікам значэннях. Паняцце свабоды даследчыца не разглядае.

К.С.Півавар [8] даследавала кашноўнасны кампанент канцэпту «воля/свабода» у беларускай і рускай лінгвакультурах. Што да беларускай часткі, то даследаванне праводзілася на матэрыяле беларускай літаратуры, якая ўваходзіць у праграму школьнага навучання. Воля і свабода ў беларускай мове разглядаюцца даследчыкам як сінанімічныя.

Н.В. Гаўрош і Н.М. Нямковіч, разглядаючы канцэпт «воля» ў мастацкіх тэкстах, згадваюць: «Канцэпт воля ўключаецца ў канцэптасферу беларусаў побач з найважнейшымі і ўніверсальнымі канцэптамі чалавек, жыццё. Нягледзячы на сэнсавую блізкасць паняццяў воля, свабода, канцэптуальна яны не тоесныя,

не ідэнтычныя ні па значэнні, ні па функцыі, што выразна выяўляецца ў супастаўленні іх семантычных палёў» [2, с. 464]. Пры апісанні паняцця свабода як састаўной часткі канцэпту «воля» даследчыкі вылучаюць тры асноўныя яго кампаненты: «чалавек як носьбіт свабоды; перашкоды, што ўзнікаюць на шляху ажыццяўлення свабоды дзеяння; сфера існавання чалавека, дзе ёсць або няма свабоды. У залежнасці ад сферы, у якой рэалізуецца свабода, неабходна адрозніваць: фізічную свабоду (незалежную ад волі чалавека), унутраную свабоду (свабоду ад перажыванняў, пачуццяў, думак), індвідуальную свабоду ў сацыяльнай сферы (праяўленне індывідуальнай свабоднай дзейнасці), калектыўную свабоду (свабода грамадства).» [2, с. 469–470]. Відавочна, што ў паняцці «свабода» акумулююцца ўзаемаадносіны чалавека і грамадства, знешняй рэальнасці і ўнутранага свету чалавека.

Канцэпт «воля» звязаны з каштоўнаснай карцінай свету чалавека, сэнсам жыцця чалавека.

Уяўленні пра сутнасць канцэпту «воля» занатаваны ў розных светапоглядных сістэмах. «У рэлігійнай карціне свету сінанімічныя рады слоў воля і свабода антанімізуюцца на базе ацэначнага кампанента значэння: воля набліжаецца да ўседазволенасці, свабода – да маральнасці выбару. У філасофскім светаўспрыманні воля аб’ядноўвае ўнутраны і знешні, магчымы і рэальны свет, што разумеецца як дзейсны пачатак чалавека і ўсяго жывога» [2, с. 464].

Наколькі блізкія ўсе згаданыя тэзісы канцэпцыі волі/свабоды У. Караткевіча, прапануем разгледзець на прыкладах.

Воля сустракаецца побач з такімі паняццямі, як думкі, імкненні, жаданні, якія дэманструюць размяшчэнне волі ў зоне паміж розумам і эмоцыямі: «*Тут нарадзіліся **думкі, Воля, імкненні, жаданні**, Тут стаў я сынам краіны, Абпален яе агнём...*» [3, с. 72].

Воля згадваецца ў адным шэрагу з паняццямі мова, матчына песня, якія прадстаўляюць паняцці самаідэнтыфікацыі, незалежнасці: «*Край сагнуўся ў спіне, Край баіцца размовы пра **волю**, Край згубіў **сваю мову** І **матчынай песні напеў**...*» [3, с. 82].

Сінанімічнасць паняццяў воля і свабода выяўляецца праз ужыванне аўтарам гэтых паняццяў у суседніх чатырохрадкоўях: «*О, як **хочацца волі**! **Жаданая воля**, ты чуеш? Асвяці мне усмешкай Апошнія дні у жыцці. Ты маўчыш? Ты не чуеш? Калісьці над светлымі водамі, Над **свабоднай зямлёю** І над Белаю Руссю маёй Шчасце сонцам заззяе, І слова **нашчадка свабоднага** Мае раны загоіць Гаючай жывою вадой.*» [3, с. 83]. Напачатку аўтар размаўляе з воляй, а напрыканцы ён кажа пра свабоду ў праекцыі будучыні, у першую чаргу адрасуючы свой тэкст нашчадкам. Індывідуальная і калектыўная свабода знітаваны ў свядомасці лірычнага героя.

У вершы «Прыганятыя» праз антанімічную пару воля-няволя выяўляецца значэнне «абмежаванне свабоды ў сферы грамадства»: «*Не наша* ***воля****, не нашы нівы, Дубы не нашы над рэчкай ціхай. … Адное наша –* ***няволя*** *дзетак*» [3, с. 335]. Асацыятыўна воля згадваецца ў адным шэрагу з найменнямі прасторы – «нівы», «дубы... над рэчкай», прасторы якая ўвасабляе Бацькаўшчыну.

Воля для У. Караткевіча – абсалютная каштоўнасць, яна перадусім: «*Больш солі, больш хлеба, больш неба Патрэбна яна была. І толькі* ***волі вялікай*** *Я б за яе не аддаў...*» [3, с. 93]; «*Здабудзем* ***волю****, пакажам ім Ці косці складзем, Марыся*» [4, с. 143]. Для кахання аўтар гатовы ахвяраваць усім, але не воляй, і нават смерць не можа прымусіць страціць волю.

Радыкальнасць поглядаў на важнасць волі (свабоды грамадства) адлюстроўваецца ў дэклараванні выбару волі перад зняволеным існаваннем краіны, народа: «*Сякуць, краіна, карак твайму сыну, Ды ты не кажы ім: «Даволі!»… Хай лепей ніколі не будзе краіны, Чым будзе* ***краіна – без волі****.*» [4, с. 269]. Выбар чалавека-грамадзяніна, якога пазбаўляюць волі, – не існаваць, памерці: «*Жыве ў Гіпербарэі люд дзівосны, Якому не балюча паміраць, Калі ў яго забраць жадаюць долю, І нівы ў жоўтай повені жытоў, І родны кут, і родныя таполі, І родны гай, і* ***залатую волю*** *І ўдзірвянелыя капцы дзядоў*». [3, с. 254]. Магчыма, ідэя лёгкай смерці звязана і з міфалагічнамі поглядамі старажытных беларусаў, якія верылі, што пасля смерці ўсе душы адляталі ў вырай, паняцця пекла ва ўяўленнях старажытных беларусаў не існавала.

Менавіта з бескампраміснага погляду на волю вынікае і ідэя змагання. Лексема «воля» сустракаецца ў кантэкстах, з адпаведным акружэннем: «*Ўспамінаю косы, і вілы, І над замкамі жаркі агонь, Безымянныя ў лесе магілы, І* ***няволі цяжкі палон, Волі нашай крывавыя роды****, Катаванні і здзек варагоў, Барацьбу і пакуты народа...*» [3, с. 108]. Лексемы «косы», «вілы», «агонь», «магілы», «няволя», «крывавыя роды», «катаванні», «пакуты народа» падкрэсліваюць, што шлях да волі цяжкі, праз гвалт.

Фізічнаму зняволенню супрацьпастаўляецца свабода духу – тое, што немагчыма адабраць у чалавека: «*Адабралі ў цябе гарады і нетры, Берагі, на якіх спявае лаза, Адбіраюць зараз нават паветра, Толькі* ***прагу да волі не могуць узяць***» [3, с. 161].

І менавіта гэта свабода духу, паводле У. Караткевіча, – аснова выжывання народа: «*Не зламаць народу магутную шыю, Не паляжа народ у быллі сухім,* ***На курганах вогнішчы волі палаюць****, Падаюць сігналы далёкім барам*» [3, с. 198]. Згадванне ў кантэксце курганоў, лічым, таксама невыпадковае. Курганы спрадвеку лічыліся сакральнымі, рытуальнымі месцамі ў беларускай культуры. Узмацняе сакральнасць паняцця волі і метафара «вогнішчы волі», бо агонь на курганах таксама запальвалі традыцыйна ў знакавыя рытуальныя моманты.

Воля бачыцца У. Караткевічам, як своеасаблівае пераадоленне, выпрабаванне: «*І пакаціўся ён, бяздольны, голы, Як пералёт, адсохлы на карню,* ***Насустрач болю і насустрач волі,*** *Насустрач злу і сернаму агню. І сніў Адам: Зямля ў глыбінным лоне* ***Няволю нараджае для жывых***» [4, с. 24]. Боль і воля стаяць у адным шэрагу. Няволя як адна з характарыстык жыцця, умовы жыцця, у якіх апынаецца чалавек і ад якой ён павінен рухацца ў накірунку волі. Адпаведна смерць разнявольвае чалавека: «*Там спакойна і добра памерці нават, І ляжаць* ***свабодным, як продак той***» [3, с. 193].

Здабыць волю – гэта ўжо выбар і выпрабаванне чалавека: «*Пройдзе нівамі, лясамі Бог* ***свабоды залатой****. Калі мы не ўстанем самі – Не падыме нас ніхто*» [4, с. 267]. У працяг тэмы здабывання волі з'яўленне атрыбутаў зброі як сімвала змагання: «***Спявае нож у час вайны за волю****, Брусок – у рабства час спявае ён*» [4, с. 131].

Думка пра тое, што свабода – не тое, што даецца чалавеку ад пачатку сцвярджае і матыў платы за яе: «*Дзе плаціць яшчэ столькі даводзіцца За* ***свабоды ўласнай лядо****? О зямля, святая калодніца, Гора, мужнасці, смерці юдоль!* [4, с. 11].

Пад воляй аўтар разумее свабоду выбару, свабоду маральнага выбару: «*Але* ***волі няма вышэйшай*** *За абраную ў гэтым жыцці, Але долі няма вышэйшай, – Аднаму на тысячы йсці!*» [4, с. 121]. Самаахвяраванне лірычны герой успрымае за гонар, місію, а не пакуту.

Воля – гэта адказнасць і, зноў-такі, дзейснасць: «*Нам першым дагледаць* ***усходы волі****, І першымі іх потым паліваць... Даволі успамінаў, досыць болю, Патрэбна неяк жыць і працаваць*» [3, с. 255].

На думку Н.В. Гаўрош, Н.М. Нямковіч, «воля найперш – гэта ўнутраны стан чалавечай душы, яе раскаванасць, найвышэйшая каштоўнасць, якая дае магчымасць асобе ажыццяўляць свае самыя чыстыя душэўныя памкненні, намеры, сцвердзіць сябе як створаную Богам істоту з дараванай ёй воляй ... паняцце волі ўваходзіць у сістэму наіўнай этыкі і эмоцый, якія функцыянуюць як складнікі адной вялікай сістэмы – чалавека» [2, с. 467].

Воля для аўтара як дзейсная матывуючая сіла: «*Якою* ***воляй, яраснай і смелай****, Якою сілай, грознай, бы ўраган, Абсмеяныя нашы каравелы Бяруць за грыву смерці акіян?!* [4, с. 66].

Пафас надзвычайнасці і ўсеперсаможнасці волі, якая ўзвышаецца нават над смерцю, на наш погляд, сугучны з гуманізмам Адраджэння. Гуманізм сучаснага грамадства – гэта павага да любога чалавека, гуманізм Адраджэння – гэта захапленне дзейснасцю чалавека і яго здольнасцю змяняць свет, гэтым прыпадабняцца Богу, быць з ім на роўных. Гэта забяспечвае волі чалавека вечнае жыццё, як у вершы «Павешаным 1863 года»: «*Ў крыві краіны нашай бель, Прыходзіць час смяротных сноў, І* ***нашай волі карабель, – Няскораны,*** *–* ***ідзе на дно****. І сёння*

*ў вечны наш працяг, У неба на світанні дня* ***Уздымуць нас, як волі сцяг, Якому й Богу нельга зняць»*** [4, с. 168–169]. Непахісная воля чалавека можа мяняць ход гісторыі, хоць часам і цаной яго жыцця, пакідаючы сімвалы памяці. Невыпадкова ў кантэксце ўжыта лексема «сцяг», як сімвал незалежнасці і перамогі. Менавіта такія людзі варытыя памяці нашчадкаў: «*Калі сонца выб'ецца з туману, Толькі іх і ўспомніць хор народаў, Воінаў сваіх, святых і зраненых,* ***Рыцараў сумлення і свабоды»*** [4, с. 289].

На карысць таго, што пад воляй аўтар разумее свабоду сведчаць антанімічныя апазіцыі, якія сустракаюцца ў вершах: воля – няволя, воля – рабства, воля – турма.

Воля належыць да моўных адзінак з абстрактным значэннем, а з пункту гледжання кагнітыўнай семантыкі, метафарызацыя выступае неабходным складнікам функцыянавання абстрактных паняццяў, «фактычна ўсе нашы абстрактныя канцэпты маралі аформлены як метафары» [11, с. 290]. Вобраз свабоды ў аўтара сімвалізуюць вецер і лясная прастора, пра што сведчаць адпаведныя спалучэнні: *лясная свабода, лес свабодны, парыў свабоднага брыза, вецер вее 3 нейкай іншай, свабоднай зямлі, ветрык свабоды.*

Паняцці свабода і Радзіма знітаваны ў шэрагу вершаў: «*І за гэта –* ***радзіму свабодную*** *Я аддам табе ў вечны дар...»* [3, с. 422]; *«Можа, здарыцца й так, што гора І вайна зноў падуць на народы, І мяне за любоў маю горкую Да* ***Вуліц Радзімы й Свабоды*** *Павязуць, каб і попел рассеяць»* [4, с. 151]; «*І на іншых вяршынях суровых (Вера! Роўнасць!* ***Свабода! Край!****) Ты струменьчык матчынай мовы, Быццам маці, не забывай»* [4, с. 132]; «...*А льву патрэбны калючы гушчар,* ***Родны край і свабода ў ім»*** [4, с. 137]. Гэта сведчыць, што калектыўная свабода (свабода грамадства) для аўтара мае важнае значэнне.

Як паказвае прааналізаваны матэрыял, паняцці воля і свабода выступаюць у паэзіі У. Караткевіча як сінанімічныя, іх карэляцыі дазваляюць разглядаць іх як адзін канцэпт. Канцэпт «воля/свабода» паўстае як экзістэнцыяльны, маральна-этычны, філасофскі. Канцэпцыю волі ў паэзіі У.Караткевіча можна прадставіць наступным чынам. Воля – гэта тое, што чалавек набывае праз свой уласны маральны выбар насуперак умовам навакольнага жыцця (якое наадварот стварае ўмовы несвабоды). У гэтым адказнасць чалавека, яго місія як часткі грамадства. Воля – гэта абсалютная каштоўнасць якой вымяраецца і вартасць чалавека. Аўтар уключае волю ў шэраг быційных паняццяў жыццё-смерць, дзе годнае жыццё – імкненне да свабоды. Рэалізацыя гэтай волі прыпадабняе чалавека да бога, сцвярджае бессмяротнасць яго духу. Абсалютную свабоду чалавек набывае паміраючы, пазбаўляючыся ад няволі грамадства.

Паняцце свабода звязваецца з узаемаадносінамі чалавека і грамадства, яго роляй у жыцці краіны, з яго адказнасцю за лёс свайго народа, нацыі.

У мастацкім светаўспрыманні сімвалічны дыяпазон канцэпту «воля/свабода» рэалізуецца пераважна праз метафарычную і метанімічную спалучальнасць ключавога слова і яго асацыятыўны патэнцыял.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Гапеева, В.М. Семантыка волі ў наіўнай карціне свету: супастаўляльны аспект (на матэрыяле беларускай і англійскай моў) / В.М. Гапеева // SLAVISTICA VILNENSIS. 2017. – Vol. 62. – С. 241–254. – DOI: https://doi.org/10.15388/SlavViln.2017.62.11693.
2. Гаўрош, Н.В. Канцэпт воля ў беларускіх мастацкіх тэкстах / Н.В. Гаўрош, Н.М. Нямковіч // Этнокультурный и социолингвистический аспекты теории и практики преподавания языков. – Минск : БНТУ, 2015. – С. 463–472.
3. Караткевіч, У.С. Збор твораў : у 25 т. / У.С. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 2012. – Т. 1 : Паэзія, 1950–1960. – 533 с.
4. Караткевіч, У.С. Збор твораў : у 25 т. / У.С. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 2012. – Т. 2 : Паэзія, 1961–1984. – 397 с.
5. Лихачев, Д.С. Концептосфера русского языка / Д.С. Лихачев // Русская словесность. От теории словесности к структуре текста. Антология. – М. : Academia, 1997. – С. 280–287.
6. Маслова, В.А. Введение в когнитивную лингвистику: учеб. пособие / В.А. Маслова. – 2-е изд., испр. – М. : Флинта : Наука, 2006. – 296 с.
7. Паўлоўская, Н.Ю. Катэгорыя мадальнасці ў сучаснай беларускай мове / Н.Ю. Паўлоўская. – Мінск : МДЛУ, 2001. – 206 с.
8. Півавар, К.С. Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту / К.С. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 155 с.
9. Суднік, М.Р.Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / М.Р. Суднік, М.Н. Крыўко. – Мінск : БелЭн, 2002. – 784 с.
10. Lakoff, G. Philosophy in the Flesh: The Embodied Mind and Its Challenge to Western Thought / G. Lakoff, M. Johnson. – New York, 1999. – 590 p.